# Беларускія замкі як асяродак сярэдневяковай культуры



**С.А. ПАЦЫЕНКА,**
**аспірантка БДУ культуры**

*На працягу ўсёй гісторыі людзям прыходзілася шукаць паратунку. Вечнымі ворагамі былі прыродныя стыхіі, хваробы, драпежныя жывёлы. Аднак самым небяспечным з'яўляўся чалавек — бязлітасны і прагны да нажывы непрыяцель. Войнам, пастаянным спадарожніцам чалавецтва, прысвячалася праца мільёнаў геніяў: таленавітых ваяроў, інжынераў, гісторыкаў, паэтаў і архітэктараў. Менавіта дойліды стварылі знешні выгляд вайны, які ў велічных руінах былых цытадэляў дайшоў да нашых часоў.*



Праца старажытных майстроў, дазваляе нам сёння убачыць свой край такім, якім ён быў многа стагоддзяў таму, бо, як сведчаць навукоўцы, «успрымаючы архітэктуру мінулага, чалавек, дзякуючы генетычнаму бачанню, свядома ці пад-свядома ўключаецца ў тую гістарычную эпоху, у якой яна была створана» [1, с. 133].

Крывавыя міжусобіцы і бесперапынныя войны з крыжакамі ператварылі Вялікае княства Літоўскае ў вялізны ваенны лагер, дзе законнасць улады была заснавана на сіле і зброі. Гэтыя прычыны прымусілі князёў «абносіць свае памяшканні магутнымі сценамі, прыстасаванымі да абароны, не столькі супраць ворага знешняга, але часта і супраць бліжэйшага сваяка» [2, с. 792].

З даўніх часоў галоўнай рысай літоўцаў была іх ваяўнічасць. «Літоўцы маюць тую, агульную з палякамі, прыроджаную якасць, па якой яны больш маюць патрэбу ў навуковай адукацыі, чым у прывучэнні да вайсковай справы, з апошняй яны хутка асвойваюцца, ледзь толькі выйдуць з дзіцячых гадоў. Літовец, можна сказаць, нараджаецца рыцарам, яму патрэбны толькі пэўны ўзрост, натуральнае ўзмацненне цела, каб выказаць свае вайсковыя здольнасці» [3, с. 27], — казаў Андрэй, першы каталіцкі епіскап Літвы.

Першапачаткова насельніцтва замкаў складалася ў асноўным з прадстаўнікоў вайсковага саслоўя, што дыктавалася ўмовамі пастаяннай небяспекі. У гэты перыяд «трываласць вярхоўнай улады была заснавана на большай ці меншай вайсковай сіле і на асабістых вартасцях князя» [3, с. 27]. Па адной з версій даследчыка А.А. Кілбаса, нават тэрмін «шляхта», якім прынята называць прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім, мае мілітарысцкае паходжанне (ад ням. *Schlacht* 'бойка, змаганне') [4, с. 3]. Кодэкс гонару беларускага шляхціца канца XIV ст. быў адпаведны: «Рыцар павінен быць хрысціянінам, мець генеалагічнае дрэва, паводзіць сябе прыстойна... Быць ад нараджэння смелым і ахвочым да боя, мужным, устрыманым у ежы і піцці... памятаць аб сваім го-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нары і гонары таварышаў... Рыцар, чалавек, якому даверана зброя, павінен паступаць добра і разумна» [4, с. 4].

Прыкладам сапраўднага ваяра заўсёды быў вялікі князь. Ён абавязкова ўдзельнічаў у паходах, змагаўся на полі бою. Шматлікія гістарычныя крыніцы сведчаць аб выключнай адвазе і мужнасці літоўскіх князёў. Нават у 1861 г. расійскі капітан генеральнага штаба А. Кораў звяртаў увагу на тое, што княжанне Міндоўга — першага вялікага князя — «адлюстравала ў сабе найлепшыя рысы ваяўнічага генія літоўцаў і замацавала за імі палітычную самастойнасць» [5, с. 96]. Вайна была ў крыві вялікіх князёў. Яскравым прыкладам гэтаму могуць быць Войшалк, Кейстут і інш.



Мірскі замак. Сучасны выгляд

Вайсковы лад жыцця беларускай арыстакратыі эпохі Сярэдневякоўя выразна адлюстраваўся ў побыце і матэрыяльнай культуры. Традыцыйна вялікія князі жылі ў замках. Замак аднача-сова з'яўляўся фартэцыяй — абарончым пунктам як для замкавага насельніцтва, так і для жыхароў мясцовых ваколіц, а таксама рэзідэнцыяй — прадстаўнічым жыллём буйных феадалаў. Аднак, калі ў XIII—XV стст. пераважаў абарончы аспект, дык у канцы XV—XVIII стст. узрасла роля рэпрэзентатыўнасці.

Першым па значнасці жыхаром замка быў яго ўладар. Самым прадстаўнічым замкам Вялікага княства Літоўскага лічыўся замак вялікага князя ў сталіцы. Існавала і шмат іншых княжацкіх замкаў. Пабудовы такога кшталту размяшчаліся ў галоўных гарадах удзельных князёў. Напрыклад, у 1254 г. вялікім князем быў абраны Войшалк, які заставаўся ў сваёй рэзідэнцыі ў Навагрудку з 1258 па 1263 г. У Крэўскім замку да 1345 г. жыў сын Гедзіміна — Альгерд. Пасля смерці вялікага князя Гедзіміна сталіцай удзела князя Альгерда, а потым яго сына Ягайлы, стала Ліда. Князь мясціўся ў замку разам са сваёй світай.

У кожным замку абавязкова існаваў вайсковы гарнізон. Мужнасць і спрыт воінаў былі гарантыяй абароназдольнасці. Аднак не толькі ад адвагі байцоў, але і ад іх сумлення залежаў лёс жыхароў замка. Часам гістарычныя крыніцы прычынай падзення цытадэляў называюць здраду гарнізона. Напрыклад, падчас Паўночнай вайны войскі Карла XII доўгі час не маглі ўзяць замак у вёсцы Жабер. Дапамог ім у гэтым камендант замка немец Ботман, які, атрымаўшы дзве тысячы дукатаў, загадаў гарнізону здацца без бою і адчыніць шведам браму [6, с. 91].

Падобныя дзеянні не маглі заставацца без увагі гаспадара краіны. Здача замка ворагу лічылася дзяржаўным злачынствам і падлягала суроваму пакаранню: «Хто бы теж замок наш неприятелю здрадою подал кроме причины голоду гвалтовного... таковый с права, кром розсуду нашого с паны радами нашими Великого князства Литовского, честь и горло тратить» [7].

Былі і кур'ёзныя выпадкі здачы замкаў. Так, у 1660 г. войскамі князя Хаванскага без бою была ўзята Навагрудская цытадэль. Наёмны гарнізон, якому своечасова не выплацілі грошы за службу, сам адчыніў браму ворагу [6, с. 51].

Асобную групу жыхароў замкаў складала княжацкая чэлядзь, якая выконвалі шматлікія дваровыя абавязкі. Звычайна гэтыя людзі не мелі сваіх надзелаў і асноўным іх заняткам была служба пры двары феадала. Чаляднікамі маглі быць як мясцовыя жыхары, так і іншаземцы, што трапілі ў палон. «Усе дадзеныя нам слугі гаварылі па-нямецку, так што мы былі як дома і ў перакладчыку нашым зусім не мелі патрэбы», — адзначаў галоўны начальнік шпіталяў Тэўтонскага ордэна граф Конрад Кібург, які ў 1397 г. на чале пасольскай місіі прыбыў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у Вільню [3, с. 7]. Верагодней за ўсё, гэтыя слугі былі захопленымі ў палон немцамі.

Частымі наведвальнікамі беларускіх замкаў былі высокія госці. Тут заключаліся уніі і складаліся дзяржаўныя дакументы. Сюды прыязджалі паслы замежных краін на ўрачыстыя цырымоніі каранацый, вянчанняў, пахаванняў літоўскіх князёў.

Быў вельмі ўражаны высокім узроўнем свецкай культуры пры двары вялікага князя Вітаўта згаданы вышэй галоўны начальнік шпіталяў Тэўтонскага ордэна граф Конрад Кібург. Надзвычай прыгожа выглядала цырымонія сустрэчы замежных паслоў пры велікакняжацкім двары. Конрад Кібург так апісваў свой візіт да Вітаўта: «Гадзіны за тры да заходу сонца прыйшлі за намі пышна апранутыя прыдворныя чыноўнікі і рыцарства, у суправаджэнні якіх, пад гукі вайсковай музыкі, мы накіраваліся да палаца вялікага князя. Ля ўвахода нас сустрэў вялікі маршалк з атрадам пакаёвых дваран; прыслуга, багата апранутая, стаяла ў два шэрагі па баках нашага шляху, як на двары, так і ў вялізных сенцах» [3, с. 32]. Уваход ў прыёмную залу ахоўвалі волатыбрамнікі, якія трымалі ў руках сярэбраныя бердышы. У самай глыбіні залы, на багата ўпрыгожаным троне, сядзеў вялікі князь Вітаўт, па абодва бакі ад яго стаялі па два маладзенькіх пажы ў белай вопратцы.

Асаблівую ўвагу Кібург звяртае на той факт, што шмат літоўцаў пры двары добра валодаюць замежнымі мовамі. Прычым не толькі сам вялікі князь, які «няблага размаўляе па-нямецку і часам умешвае лацінскія фразы, як бы жадаючы выказаць сваю вучонасць» [3, с. 34], але і яго шматлікія прыдворныя.

Як бачым, акрамя вайсковых вартасцей, літоўскія арыстакраты адрозніваліся высокім узроўнем культуры. Працяглае пакланенне язычніцкім багам прывяло да таго, што ўвесь цывілізаваны хрысціянскі свет доўгі час лічыў Літву прыстанішчам дзікуноў і невукаў. Аднак літоўскія князі здолелі абкружыць сябе людзьмі, вартымі двара буйной еўрапейскай дзяржавы. Гэта праявілася як у знешняй свецкасці (наяўнасць выпрацаваных норм прыдворнага этыкету, усталяваны цырыманіял), так і ва ўзроўні асветы і адукаванасці пры двары вялікага князя. Нездарма знешні бляск і раскоша, за якімі часта стаялі мудрая палітыка і дальнабачная дыпламатыя, здзіўлялі іншаземцаў, што траплялі да велікакняжацкага двара.


Памяшканне ў паўднёва-заходняй вежы Мірскага замка

1. *Середюк И.И.* Восприятие архитектурной среды. — Львов: Вища школа, 1979. — 202 с.

2. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Виленская геберния. — СПб., 1861. — 804 с.

3. Дневник посольства главного начальника госпиталей Тевтонского ордена графа Конрада Кибурга с товарищами к великому князю литовскому Витовту в 1397 г. // Записки имп. Новороссийского ун-та. — Одесса, 1868. — Вып. 1. — Т. 2. — С. 1—41.

4. *Килбас А.А.* Культура привилегированного сословия на территории Беларуси в XIV—XVI вв. // Вестник Белорусского университета. Серия 3. — 1998. — № 2. — С. 3—6.

5. *Шимелевич М.* Город Лида и Лидский замок. — Вильно, 1905. —142 с.

6. *Ткачоў М.А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. — Мн.: Навука і тэхніка, 1978. — 140 с.

7. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. — Мн.: БелСЭ, 1989. — 573 с.

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ